# МЫ і ЧАС

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

№ 17 (277)
СУБОТА, 15 КАСТРЫЧНІКА 2016 ГОДА


# ВОСЕНЬСКІ ДЗЕНЬ ГОД КОРМІЦЬ

Гэта прыказка надзвычай актуальная сёння, калі прадпрыемствы і калгасныя гаспадаркі клапоцяцца пра тое, каб належным чынам запасціся садавінай і гароднінай на зіму. Тым больш, калі ёсць чым запасацца. Да прыкладу, яблыкамі – толькі бяры ды збірай. Але ж ці так проста сабраць некалькі тон яблыкаў? Вось і просіць ужо некалькі год Талачынскі кансервавы завод дапамогі ў нашага ўніверсітэта. А машэраўцы рады старацца. Вядома, збор яблыкаў – гэта магчымасць не толькі вырвацца па-за межы горада, весела правесці час, бліжэй пазнаёміцца, але і зарабіць грошы. Таму нічога дзіўнага, што студэнты адпраўляюцца на сельскагаспадарчыя работы не пад прымусам, а самі выказваюць жаданне збіраць яблыкі ці перабіраць бульбу.

«Сёлета ПА ГА “БРСМ” ВДУ імя П.М. Машэрава з правамі раённага камітэта ўлетку накіравала ў Талачын атрад у складзе трыццаці чалавек на чале са студэнтам 5 курса ФлФ Сяргеем Заведзеевым, – расказвае выконваючы абавязкі першага сакратара Марыя Лустава. – Восенню было сфарміравана 13 сельскагаспадарчых атрадаў агульнай колькасцю 350 чалавек, якія на пачатку верасня прыступілі да працы. 15 кастрычніка апошнія студэнты вяртаюцца ў горад. Наогул, кіраўніцтва кансервавага завода задаволена працай машэраўцаў. Неаднаразова на адрас нашага ўніверсітэта прыходзілі пісьмы з падзякай».

У Талачыне для нашых хлопцаў і дзяўчат былі створаны ўсе ўмовы для прадуктыўнай працы і паўнацэннага адпачынку. Адна палова студэнтаў пражывала на базе спартыўнага летніка «Ніва», другая – у інтэрнаце гасцінічнага тыпу. Да таго ж пражыванне было поўнасцю бясплатным. Харчаваліся студэнты тры разы на дзень.









У вольны час моладзь знаходзіла занятак па душы: машэраўцы займаліся спортам, бавілі час на прыродзе, арганізоўвалі канцэрты, праводзілі спартыўныя спаборніцтвы. Прыдумалі нават жартаўлівае свята «Пасвячэнне ў калгаснікі».

«Усе нашы студэнты папрацавалі добра. Асабліва хацелася б адзначыць хлопцаў чацвёртага курса ФФКіС: Ігара Марозава, Паўла Распорскага і Рамана Фёдарава, якія выконвалі цяжкую працу. Яны ссыпалі бульбу ў мяхі і грузілі іх у фуры, – зазначае старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту А.А. Аляксеенка. – Прыемна, што і кіраўніцтва прадпрыемства паклапацілася пра студэнтаў: ім выдалі цёплае адзенне, абутак, дажджавікі».

За час працы ў калгасе хлопцы і дзяўчаты сабралі неблагі ўраджай садавіны. Адна частка ўраджаю пойдзе на перапрацоўку, другая – на продаж, каб узімку ўсе змаглі паласавацца смачнымі яблыкамі з талачынскага саду.

Сапраўды, восеньскі дзень год корміць. І ў гэтым нашыя студэнты ўпэўніваюцца ўжо не першы год.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

**На здымках:** *(уверсе злева направа)* студэнты 2 курса ФФКіС Уладзімір Ліфанаў і Мікалай Рапінскі, выконваючы абавязкі першага сакратара ПА ГА «БРСМ» ВДУ імя П.М. Машэрава Марыя Лустава і старшы выкладчык кафедры фізічнага выхавання і спорту А.А. Аляксеенка; *(унізе злева направа)* студэнт 2 курса ФФКіС Андрэй Сушчэвіч, намеснік дэкана ФСПіП па выхаваўчай рабоце Н.Я. Марціновіч са студэнтамі.

**Фота Настассі ЛАЗЕБНАЙ.**

# НАВІНЫ, ПАДЗЕІ, ФАКТЫ

Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Каралеўства Швецыі ў Рэспубліцы Беларусь Марцін Оберг у межах свайго афіцыйнага візіту на Віцебшчыну наведаў наш універсітэт, дзе сустрэўся са студэнтамі, магістрантамі, аспірантамі, прафесарска-выкладчыцкім складам і кіраўніцтвам. Падчас сустрэчы дырэктар Цэнтра шведскіх даследаванняў Анастасія Майская з дапамогай прэзентацыі пазнаёміла прысутных з магчымасцямі навучання беларускіх студэнтаў у Швецыі. У прыватнасці, яна расказала пра стыпендыяльныя праграмы (праграма Вісбю для магістрантаў, праграма Вісбю для аспірантаў, праграма Вісбю на шведскай мове), прадугледжаныя шведскай адукацыяй. Падрабязней пазнаёміцца з праграмамі навучання можна на сайце Шведскага інстытута *www.si.se* і на сайце пра навучанне ў Швецыі *www.studyinsweden.se*.

***

Першае ў бягучым навучальным годзе пасяджэнне савета ўніверсітэта прайшло 29 верасня. На пачатку савета былі ўручаны нагрудныя знакі «Выдатнік адукацыі» дацэнту кафедры псіхалогіі Т.Я. Касарэўскай і дацэнту кафедры заалогіі С.І. Дзянісавай.

На пасяджэнні абмяркоўваліся вынікі прыёмнай кампаніі 2016 года і акрэсліваліся задачы па наборы студэнтаў у 2017 годзе. З асноўным дакладам выступіў адказны сакратар прыёмнай камісіі А.В. Лукомскі. Удзел у абмеркаванні прынялі прарэктар па вучэбнай рабоце В.І. Туркоўскі, дэкан матэматычнага факультэта А.М. Залеская, дэкан юрыдычнага факультэта А.А. Бачкоў, дырэктар Полацкага каледжа Т.Г. Полушкіна і дырэктар Аршанскага каледжа А.А. Зулёў.

***

У віцебскім Мастацкім музеі адчынілася выстава Людмілы і Міхася Цыбульскіх пад назвай «Феерыя колераў: ад эцюда да кампазіцыі».

Міхась Леанідавіч – дацэнт кафедры выяўленчага мастацтва мастацка-графічнага факультэта нашага ўніверсітэта, выбітны мастацтвазнаўца і мастак. Многія ведаюць Міхася Цыбульскага як арганізатара шматлікіх выстаў, у тым ліку міжнародных, куратара праектаў і, безумоўна, як уладальніка ганаровага звання «Чалавек года Віцебшчыны».

Яго жонка Людміла скончыла тэхналагічны ўніверсітэт, больш за 30 год працуе на ААТ «Віцебскія дываны». Яна прымала ўдзел у міжнародных мастацкіх выставах і пленэрах, у тым ліку ў выставе вырабаў для інтэр’ера ў Гановеры (Германія). Дызайнерскія дываны Людмілы неаднаразова прызнаваліся найлепшымі, а сама яна як лепшы дызайнер у 2010 годзе кіраўніцтвам Віцебскага аблвыканкама была ўзнагароджана спецыяльным прызам.

***

Студэнцкі савет універсітэта разам з Тэрытарыяльным цэнтрам сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Кастрычніцкага раёна горада Віцебска арганізавалі і правялі сумесную акцыю, прымеркаваную да Дня пажылога чалавека. На працягу тыдня студэнты розных факультэтаў дапамагалі пенсіянерам: перакопвалі агароды, прыбіралі прысядзібныя участкі, збіралі яблыкі, уцяплялі на зіму вокны.

***

У чацвёрты раз у нашым універсітэце прайшла спартландыя «А ну-ка, перваки!». Удзельнічалі ў спаборніцтвах каманды інтэрнатаў, у склад якіх увайшлі студэнты першых курсаў усіх факультэтаў, у тым ліку і замежныя грамадзяне. Арганізавалі і правялі спаборніцтвы інструктары спартыўнага клуба нашага ўніверсітэта І.Г. Шатуха, А.І. Серабракоў, П.І. Яско і А.А. Батуркін пад кіраўніцтвам галоўнага суддзі, кіраўніка спартыўнага клуба А.В. Галавінца. Пераможцамі спартландыі сталі студэнты з інтэрната №5, другое месца заняла каманда інтэрната №4, трэцімі сталі першакурснікі з інтэрната №3. Салодкія прызы і дыпломы дапамагла набыць ПА ГА «БРСМ» універсітэта.

**Алеся ДУБРОЎСКАЯ.**

# ПРЫМАЛІ ГАСЦЕЙ

З 2 па 9 кастрычніка ў нашым універсітэце знаходзілася дэлегацыя выкладчыкаў, студэнтаў і магістрантаў Зеленагурскага ўніверсітэта (Польшча).

У першы дзень адбылася афіцыйная сустрэча прадстаўнікоў адміністрацый універсітэта і філалагічнага факультэта, польскіх гасцей і членаў Віцебскага абласнога моладзевага грамадскага аб'яднання «Цэнтр садзейнічання тэрытарыяльнаму развіццю і прававому інфармаванню "Перспектыва"». Былі абмеркаваны пытанні па стварэнні цэнтра славянскіх моў на базе Інстытута неафілалогіі Зеленагурскага ўніверсітэта і філалагічнага факультэта ВДУ. У нашай альма-матар польскія госці наведалі заняткі ў першую чаргу па дысцыплінах, якія іх найбольш цікавілі: па методыцы выкладання літаратуры, сучаснай беларускай мове, польскай мове і г.д. Была падрыхтавана і культурная праграма. Для гасцей правялі азнаямляльную экскурсію па Віцебску. Дэлегацыя наведала таксама музей-сядзібу І.Я. Рэпіна «Здраўнёва», Нацыянальную бібліятэку Беларусі ў Мінску і пабывала на абласным свяце ўраджаю «Дажынкі», якое праходзіла ў Сянно.

Напрыканцы лістапада студэнты нашага ўніверсітэта плануюць наведаць Зялёную Гуру, дзе іх будуць чакаць польскія калегі, з якімі ўжо склаліся сяброўскія стасункі.

**Іна ШЫРКЕВІЧ, студэнтка 3 курса ФлФ.**

ВОЛОНТЕРСТВО

# ВИЗИТ ДОБРА «ЗОЛОТАЯ ОСЕНЬ»

В конце сентября волонтеры филологического факультета нашего университета отправились в ГУСО «Витебский дом-интернат для престарелых и инвалидов» с благотворительным концертом «Золотая осень», приуроченным к Международному дню пожилых людей.

Ребята подготовили праздничную программу: они читали стихотворения классиков, пели песни и белорусские частушки. Администрация учреждения предоставила студентам для проведения мероприятия актовый зал и техническое оборудование. Дружеская атмосфера и непередаваемое ощущение совершения хорошего дела создавали поистине праздничное настроение.

На протяжении всего концерта зрители активно поддерживали волонтеров громкими аплодисментами и восторженными улыбками. А после выступления всех пожилых жителей дома-интерната ожидал приятный сюрприз – мешок с фруктами и сладостями.

Филологический факультет постоянно оказывает помощь Витебскому дому-интернату для престарелых и инвалидов, организовывая поэтические встречи и благотворительные акции. Ребятам приятно уделить внимание жителям дома-интерната, послушать их жизненные истории, побеседовать с ними.

Социальная помощь и благотворительность не принудительное дело, а неотъемлемая часть жизни людей, желающих помочь другим. Однако не стоит забывать и о своих пожилых родственниках. Почаще уделяйте им внимание и окружайте заботой.

**Игорь ОВЧИННИКОВ, студент 4 курса ФлФ.**







**На снимках:** *(вверху слева направо)* поет студент 4 курса ФлФ Сергей Леонович; выступает заслуженный учитель БССР Фёдор Филиппович Сапроненко; *(внизу)* студенты-волонтеры.

**Фото автора.**

ПРОЕКТ

# МОЛОДЕЖНАЯ НАУКА В ВУЗЕ

В конце сентября в Белорусском государственном педагогическом университете имени Максима Танка прошел седьмой этап Фестиваля молодежной вузовской науки, в котором приняла участие и делегация нашего учебного заведения, состоящая из студентов и преподавателей.

Фестиваль – это уникальный проект, стартовавший в 2016 году по инициативе Министерства образования Республики Беларусь с целью привлечения в науку талантливой молодежи. Девиз его седьмого этапа – «Психолого-педагогическая наука – ресурс устойчивого развития социума».



Начался фестиваль с интерактивной выставки, в рамках которой было организовано семь площадок: «Развитие молодежной науки в кластере», «Научные школы кластера», «Педагогическая наука и практика кластера», «Молодые ученые кластера», «Научно-образовательная среда кластера», «Сетевое взаимодействие в кластере», «Инновационные и экспериментальные разработки кластера». В выставке достижений в области научно-исследовательской деятельности субъектов учебно-научно-инновационного кластера непрерывного педагогического образования были представлены научные школы докторов педагогических наук, профессоров Е.Я. Аршанского и А.П. Орловой, семь студенческих научных кружков и лабораторий, действующих в университете, а также достижения молодых ученых психолого-педагогического направления.

Профессор Е.Я. Аршанский и доцент А.А. Белохвостов презентовали проект «Система непрерывной методической подготовки учителя химии к работе в условиях информатизации образования». По итогам фестиваля были выданы соответствующий сертификат и памятный диск.

В то время как одни представители нашего университета принимали участие в интерактивной выставке, другие (старший преподаватель кафедры коррекционной работы О.В. Корнилова и студенты педагогического факультета Анна Бумаженко и Ирина Евменчик) представляли свой проект «Каждый имеет право быть счастливым» на ярмарке инновационных проектов в социально-образовательной сфере. За участие в ней им был вручен сертификат.

**А.Н. ДУДАРЕВ, председатель совета молодых ученых.**

МОВАЗНАЎСТВА

# З ЦІКАЎНАСЦЮ ДА РОДНАГА СЛОВА

Напрыканцы верасня на філалагічным факультэце адбылося першае ў гэтым навучальным годзе пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры», які дзейнічае пры кафедры беларускага мовазнаўства. З назвы гуртка вынікае, што мова разглядаецца ў цеснай узаемасувязі з культурай: гурткоўцы знаходзяць навуковае абгрунтаванне таго, як беларуская мова захавала ў сабе звесткі пра традыцыі, гісторыю, ментальнасць нашага народа, а таксама развіваюць іншыя напрамкі сучаснага мовазнаўства.

На першых занятках мы абмеркавалі памятныя дні 2016 года (узгадалі слынных дзеячаў-юбіляраў Яфіма Карскага, Яна Чачота, Генадзя Бураўкіна, Максіма Багдановіча і інш.), прасачылі ролю студэнцкіх навуковых гурткоў у развіцці мовы – ад філаматаў да сённяшніх навуковых аб'яднанняў у розных ВНУ. Правялі анкетаванне, пасля якога вырашылі чаргаваць разнастайныя формы дзейнасці гуртка: заслухоўванне дакладаў студэнтаў і выкладчыкаў, сустрэчы з вучонымі, знаёмства з навінкамі літаратуры, экскурсіі, наведванне музеяў і навучальных устаноў.

Удзел у рабоце гуртка, безумоўна, будзе карысным для кожнага: тут ёсць магчымасць развіць навыкі навуковага даследавання, а таксама пашырыць свае веды пра родную мову і культуру. Таму запрашаем вас на нашыя пасяджэнні!

**Кацярына ПІВАВАР, стараста навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры».**

СОДРУЖЕСТВО

# ДЕСЯТЬ НЕЗАБЫВАЕМЫХ ДНЕЙ ТВОРЧЕСТВА

В прошлом учебном году в рамках договора о сотрудничестве в Зеленогурском университете проходила языковую практику группа наших студентов-филологов. А в сентябре на осенний пленэр туда выехали представители художественно-графического факультета. Семь студентов старших курсов в течение десяти дней рисовали различные места нашего города-побратима на западе Польши. Их можно было встретить в районе виноградного парка и оранжереи, площади Героев, ратуши и площади Старого рынка, парка Тысячелетия и банной башни. Некоторых привлекли хорошо сохранившиеся фрагменты крепостных стен, которые окружали средневековую Зелёную Гуру. Что у них получилось, скоро можно будет увидеть на итоговой выставке. Не столько руководителями, сколько советчиками и консультантами студентов были декан факультета Ю.П. Беженарь, доцент кафедры изобразительного искусства М.Л. Цыбульский, художник-дизайнер ОАО «Витебские ковры» Л.А. Цыбульская, а переводчиком группы – автор этих строк.

В структуре Зеленогурского университета нет отдельного худграфа, а есть факультет искусств, состоящий из Института музыки и Института визуальных искусств и расположенный в отдельном учебном корпусе на улице Вишнёвой, 10. В нем в один из дней состоялась встреча с руководством факультета, а потом профессор Паулина Коморовская–Биргер из Института визуальных искусств провела для нас интереснейшую экскурсию по учебному корпусу, показала кафедры, аудитории, мастерские, студенческие художественные галереи. Все увиденное свидетельствовало о том, что за 25 лет самостоятельной работы Институт визуальных искусств сумел хорошо зарекомендовать себя в плане учебной работы и одновременно стал центром современного искусства не только регионального характера. В этом нет ничего удивительного, так как здесь работают специалисты различных художественных дисциплин высокой квалификации. Многие из них учились в художественных вузах Познани, Вроцлава, Варшавы. Некоторые там и работают, а в Зеленогурский университет приезжают проводить занятия как совместители.



В связи с 25-летием Института визуальных искусств университетское издательство выпустило монографию «Вуз как место искусства». В ней представлены результаты исследований зеленогурских ученых, которые были проведены в 2012–2014 гг. и посвящены месту и значению искусства в учебных программах вузов. Представлены здесь и материалы международной научной конференции под одноименным названием.

Познакомились мы и с юбилейной выставкой преподавателей института «Сады». Эта разноплановая экспозиция развернута в Новом замке графа Германа фон Пюклера в немецкой части парка города Бад Мускау за пограничной рекой Нейсе. Здесь представлены работы как маститых художников-педагогов института, так и молодых ассистентов. Каждый из них ищет свой индивидуальный способ интерпретации окружающего мира. При помощи языка искусства они стараются показать как простые, повседневные дела, так и универсальные ценности. Как видно, способов сделать это есть множество. Эти поиски напоминают бесконечное путешествие по собственному саду, в котором есть свои заветные уголки, лабиринты и тропинки. Это своего рода символический сад их творческих возможностей.



Большое внимание уделили нам активисты местного отделения общества дружбы «Польша–Восток» во главе с его председателем Станиславом Домаш-Домашевичем. Эта общественная организация является правопреемником общества польско-советской дружбы. Она заинтересована в расширении сотрудничества с бывшими советскими республиками, прежде всего с Беларусью, Россией, Украиной и Молдовой. Представители общества организовали для нас посещение краеведческого музея и художественного лицея. В процессе дружеского общения мы обсудили возможности нашего сотрудничества в будущем. Успели мы также побывать и во Вроцлаве, чтобы полюбоваться архитектурой этого красивого польского города. А своего рода нашим штабом в Зелёной Гуре стала художественная галерея с ее богатой библиотекой по искусству. И это неслучайно, поскольку ее директор Войцех Козловский, который по совместительству работает в университете и знает русский язык, был нашим куратором. При всей своей занятости он постоянно был с нами на связи и готов был оказать помощь.

Десять дней в Зелёной Гуре пролетели очень быстро. Но думаю, что впечатления об увиденном и услышанном там у каждого из нас останутся на всю жизнь.

**Фёдор ШКИРАНДО.**

# ПРАВО НА СЧАСТЬЕ

Студентка 4 курса математического факультета Наталья Гречищенко – молодая мама. Ее дочке, очаровательной Полине, всего четыре с половиной годика. И пусть девушке пришлось столкнуться со многими трудностями, пусть сегодня ей непросто одной воспитывать дочь и учиться, все равно Наташа счастлива, ведь она – мама.

О том, как плохо жить без матери, студентка знает не понаслышке. Когда ей было пять лет, маму лишили родительских прав, и трое детей, включая полугодовалую Раю, оказались в детском доме в Орше. Раю вскоре удочерили, где она живет сегодня, неизвестно: сотрудники учреждения не разглашают тайну. Наташа же попала в приемную семью в город Чашники, а ее брат жил в детдоме до совершеннолетия.

Учась на первом курсе в университете, студентка узнала, что беременна. Отец будущего ребенка был против его рождения, но девушка решила рожать несмотря ни на что.

«С отцом дочери мы отношения не поддерживаем, – делится студентка. – Знаю только, что он женился, у него своя семья. Из роддома меня встречали одногруппники. Они же и позаботились о том, чтобы на первое время у нас с Полиной было все необходимое. Поначалу мне было очень тяжело: не у кого было спросить, как кормить, как купать малышку, поэтому я часто плакала, особенно по ночам. Но я справилась, и это – главное».



В декретном отпуске Наталья была два года, затем решила восстановиться в университет. Однако для этого нужно было устроить ребенка в садик. Сделать это было не так просто. На помощь девушке пришел председатель студенческого профкома А.Н. Трубин, который поспособствовал тому, что Полину оформили в дошкольное учреждение. Кстати, профсоюз поддерживает студентку и материально: раз в год ей оказывается финансовая помощь.

А три года назад Наталья через передачу «Жди меня» нашла свою маму. Оказалось, она живет в Могилёве, у нее новая семья и двенадцатилетняя дочь Кристина. Вначале мать и дочь общались по телефону, затем студентка решилась на встречу и, взяв с собой маленькую Полинку, отправилась в дорогу. Так Наташина мама познакомилась не только с дочкой, которую не видела с пятилетнего возраста, но и с внучкой.

Сегодня они поддерживают отношения, регулярно созваниваются, встречаются, а Полинка нередко гостит у бабушки по нескольку дней.

Весной Наталья окончит университет и получит диплом учителя физики. Так как студентка учится за счет средств бюджета, ей нужно будет два года отработать по распределению. Девушка готова к тому, что, возможно, придется уехать из Витебска на район. И это ее не пугает. Тем более, что рядом с Наташей сегодня есть надежный молодой человек, который поддерживает ее во всем и которого очень любит маленькая Полина. И, глядя на эту сильную девушку, старательную студентку, заботливую молодую маму, которая преодолела столько жизненных трудностей и не сломалась, хочется верить, что у нее все будет хорошо, ведь она, как никто, достойна счастья.

**Алеся ДУБРОВСКАЯ.**

З НАГОДЫ

# «НЕ БАЮСЯ, ШТО МОЙ ВЕК НЯВЕЧНЫ…»

Вядомыя радкі з аднайменнага верша выбітнага беларускага пісьменніка Ніла Сымонавіча Гілевіча. Менавіта яны сталі назвай літаратурнай вечарыны, прысвечанай 85-годдзю з дня нараджэння паэта. На сустрэчу, якая праходзіла ў чытальнай зале нашага ўніверсітэта, былі запрошаны як студэнты-філолагі, так і ўсе тыя, хто неабыякавы да творчасці лірыка.

Ніл Сымонавіч быў апошнім народным паэтам Беларусі, таму невыпадкова старшы выкладчык кафедры літаратуры Ірына Вацлаваўна Саматой пачала сустрэчу з ушанавання памяці пісьменніка:

«Гэта быў творца універсальнага кшталту. Ён аднолькава таленавіта працаваў у розных жанрах літаратуры: выдаваў зборнікі лірыкі, творы для дзяцей, кнігі сатыры і гумару і інш.». Студэнтамі была шырока прадстаўлена паэзія Ніла Гілевіча. Яны чыталі вершы, прысвечаныя роднаму краю, маці, каханню, спявалі песні на словы лірыка. Сярод запрошаных гасцей на вечарыне прысутнічалі былыя студэнты Ніла Сымонавіча – дацэнт кафедры літаратуры Вольга Іванаўна Русілка і загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Генадзь Антонавіч Арцямёнак. Кожны з іх падзяліўся сваімі ўспамінамі пра пісьменніка. Распавядаючы пра яго жыццё і творчыя дасягненні, Генадзь Антонавіч падкрэсліў незвычайную любоў паэта да роднай мовы:

«Ніл Гілевіч усё жыццё прысвяціў барацьбе за пашырэнне сферы ўжытку беларускай мовы. Ён стаяў ля вытокаў Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны, выдаў цалкам прысвечаную роднай мове кнігу «Любоў прасветлая». Пісьменнік марыў пра тое, што беларуская мова будзе паўнацэннай гаспадыняй у сваёй краіне. Гэтую мару ён пранёс праз усё сваё жыццё».

Пра першае ўражанне ад знаёмства з лірыкам расказала дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Алена Сяргееўна Дзядова – актыўная даследчыца яго творчасці:

«Ніл Гілевіч – чалавек, у якім арганічна спалучалася ўсё: любоў да Беларусі, любоў да мовы і цвёрдая грамадзянская пазіцыя».

Завяршылася вечарына словамі-пажаданнямі І.В. Саматой: ісці па жыцці разам з цудоўнымі песнямі і мудрымі думкамі Ніла Сымонавіча Гілевіча.

**Іна ШЫРКЕВІЧ, студэнтка 3 курса ФлФ.**
**Фота Алесі ДУБРОЎСКАЙ.**



**На здымку: пра сваё знаёмства з Нілам Гілевічам расказвае А.С. Дзядова.**



**На здымку: выступае Г.А. Арцямёнак.**



**На здымку: падчас мерапрыемства.**

ЮБІЛЯРЫ

# МАЁ ЖЫЦЦЁ – МАЁ БАГАЦЦЕ

***Жыццё пражыць – не поле перайсці. Гэтая прыказка чамусьці ўсплывае ў памяці, калі пачынаеш аналізаваць ці ўзгадваць самыя яркія старонкі сваёй біяграфіі, асабліва напярэдадні юбілейнай даты нараджэння. І не важна, колькі табе гадоў.***

***Здаецца мне, што і нашыя юбіляры – доктар гістарычных навук, прафесар Іван Уладзіміравіч Мандрык і кандыдат гістарычных навук, дацэнт Віктар Уладзіміравіч Акуневіч – падчас святкавання на нейкую хвілінку ў думках прайшліся па сваім жыццёвым полі і спыніліся на незабыўных яго месцах. Зрэшты, няхай юбіляры самі раскажуць пра сябе.***



**Іван Уладзіміравіч Мандрык:** «Немагчыма сказаць, што нейкі перыяд майго жыцця ўдалы, а нейкі – не зусім. Не буду крывіць душой: жыццё было складаным, працоўную біяграфію пачынаў токарам. Затым былі камсамол, партыйная работа, навуковая дзейнасць. Кандыдацкую дысертацыю абараніў у 1982 годзе. Гэта былі надзвычай плённыя гады. Я быў вельмі рады, што трапіў у кагорту людзей, якія мелі навуковыя ступені. Хоць пасада сакратара партыйнай арганізацыі ў нашым універсітэце была для мяне важнай, усё ж такі я вырашыў цалкам прысвяціць сябе навуцы і пісаць доктарскую дысертацыю. За два гады сабраў увесь матэрыял і быў гатовы ўжо да абароны, але адбылася нечаканасць – развал Савецкага Саюза, а разам з ім – і пераасэнсаванне каштоўнасцей. Я быў вымушаны яшчэ дзесяць гадоў дапрацоўваць сваю доктарскую дысертацыю, а ў 2004 годзе яе абараніў.

Плённым перыядам для мяне быў той час, калі я 15 гадоў узначальваў Віцебскі філіял Міжнароднага інстытута працоўных і сацыяльных адносін. Потым вырашыў звязаць свой лёс з нашым універсітэтам. Сёння я атрымліваю задавальненне ад сваёй працы на гістарычным факультэце, дзе рыхтуюць добрых спецыялістаў, якія прынясуць карысць нашай дзяржаве. І калі б у мяне спыталі сёння, што б я хацеў змяніць у сваім жыцці, то адказаў бы: нічога, толькі б улічыў памылкі мінулага, каб зноў не наступіць на адны і тыя ж граблі».



**Віктар Уладзіміравіч Акуневіч:** «У маім жыцці я б вылучыў два самыя плённыя перыяды. Першы звязаны з навуковай дзейнасцю, якой я займаўся вельмі актыўна: напісанне кандыдацкай дысертацыі і яе абарона, даследаванні ў пэўных накірунках (нацыянальна-вызваленчы рух, грамадскі рух, гісторыя Віцебшчыны). Другі перыяд жыцця звязаны пераважна з педагагічнай дзейнасцю. Падчас працы ў школе я атрымаў вышэйшую катэгорыю настаўніка, а мой вучань двойчы перамагаў на алімпіядзе па гісторыі ў рэспубліцы. Больш за 30 гадоў я працую са студэнтамі. Яны ў нас добрыя, старанныя, дапытлівыя, імкнуцца як мага больш ведаць. На сваіх занятках я вучу іх думаць: не ўспрымаць гісторыю як нейкую казку ці паданне, а разважаць, аналізаваць – гэта самае галоўнае. Цікаўнасць хлопцаў і дзяўчат да гісторыі падштурхоўвае мяне грунтоўна рыхтавацца да заняткаў, адшукваць новыя факты.

Жыццём сваім я цалкам задаволены. Я фаталіст, таму як яно складваецца, так няхай і складваецца. Некаторых памылак толькі, магчыма, цяпер не зрабіў бы...»

**Ірына МІКУЦКАЯ, студэнтка 3 курса ФлФ.**



***Паважаныя Іван Уладзіміравіч і Віктар Уладзіміравіч!***

*Калектыў гістарычнага факультэта віншуе вас з Днём нараджэння! Шчыра зычым моцнага здароўя, невычэрпнай энергіі, плёну ў працы, навуковых адкрыццяў, дабрабыту, шчасця!*



# УКРАШАЯ МИР ВОКРУГ

Древний Полоцк радует и привлекает жителей и многочисленных гостей не только самобытными историческими местами, но и ухоженными скверами и цветниками, зелеными островками во всех микрорайонах города. Свой посильный вклад в благоустройство вносят и учащиеся Полоцкого колледжа, ухаживая за территорией, прилегающей к учебному заведению.

Каждое утро уютный дворик колледжа встречает гостей, учащихся и преподавателей яркими красками, дарит заряд позитива, а вечером делится богатыми цветочными ароматами и приятной прохладой декоративных кустарников, величественных елей и каштанов. Чудесная атмосфера на территории колледжа создана людьми, которые заботятся и стремятся украсить родной уголок.

Волонтерами экологического отряда «РаДуГа» (раскрой душу гармонии) под руководством Леоноры Иосифовны Слиской на территории колледжа созданы красивые ландшафтные композиции: аккуратные извилистые дорожки, изогнутые линии-цветники, декоративные группы из деревьев и цветущих кустарников. В тенистых уголках рядом с удобными скамейками расположены альпийские горки, на которых среди камней растут папоротники, колокольчики, хоста. Органично вписывается в композицию памятник Герою Советского Союза Татьяне Савельевне Мариненко, выпускнице педагогического училища. А объединяет все детали в единое целое зеленый газон.

В колледже учащиеся обучаются в основном четыре года, проходят путь от первокурсника до профессионала. В названии ландшафтного дизайн-проекта «Четыре сезона», реализованного волонтерами колледжа, также заложена идея движения вперед – от маленького ростка до цветочной палитры.

Вот и в сентябре чистый, ухоженный дворик колледжа вновь собрал друзей-старшекурсников и встретил новичков-первокурсников, которые, сохраняя многолетние традиции, обязательно будут любить колледж, ухаживать за каждым его уголком, делая его еще красивее и привлекательнее не только для себя, но и для жителей и гостей Полоцка.

**Литературная мастерская «Першыя кроки» Полоцкого колледжа ВГУ имени П.М. Машерова.**

# ОТКРОЙ ДЛЯ СЕБЯ ВИТЕБЩИНУ

Часто ли мы, погруженные в свои дела, задумываемся о том, насколько красив мир вокруг нас. А чтобы увидеть что-то интересное, совершенно необязательно ехать куда-то далеко. Рядом с Витебском есть много чудесных мест, которые следовало бы посетить каждому. В этом мы, студенты первого курса исторического факультета, члены клуба «Краевед», смогли убедиться, когда вместе с учащимися Витебского кадетского училища отправились в поход в Лётцы. А нашим гидом стал известный краевед, доцент кафедры истории Беларуси нашего университета Николай Васильевич Пивовар.

Первой находкой для нас было «чудо-дерево» (большая ель с несколькими макушками), которое, говорят, исполняет любые желания. Пройти мимо этого дерева невозможно – настолько необычно оно выглядит! Так и представляется картина, будто сейчас прилетит Баба-яга и сядет на одну из закрученных веток. Немного пофантазировав и загадав желание, мы отправились дальше. По пути заприметили курганы, которых, по нашим подсчетам, было не меньше восьми. Интересно, что на этом месте жители создали комплекс с реконструкциями обрядов захоронения разных времен (курганы, грунтовые могилы, каменные кресты).

Безусловно, заинтересовало нас и загадочное место, где, по поверью местных жителей, люди теряются во времени. Только представьте: самый обычный человек пошел в лес за ягодами или грибами, а вернулся лишь через несколько дней, сам не заметив такого временного разрыва. Увидели мы также уникальный памятник природы – сросшиеся березу и дуб, в лесу набрали много яблок, из которых потом сварили компот.

Во время нашего похода мы очень подружились с кадетами, которые, несмотря на свой юный возраст, оказались более опытными путешественниками, чем мы. А какую уху на костре они приготовили! А как пели мы вместе песни под гитару у костра!

Надеемся, что еще не раз вместе с нашим преподавателем и кадетами мы отправимся в небольшое путешествие по родной Витебщине.

**Евгения МАЦУЛЕВИЧ, Анна СЛАВИНСКАЯ, студентки 1 курса ИФ.**

# БРАЗИЛЬСКИЕ МОТИВЫ НА УЛИЦАХ СТОЛИЦЫ

С 28 августа по 17 сентября в Минске прошел бразильско-белорусский фестиваль урбан-арта «Vulica Brasil». Фестиваль включал в себя ряд мероприятий, посвященных развитию уличного искусства, презентации новых направлений стрит-арта. Уличные художники из Беларуси и Бразилии, вдохновленные культурой и природой нашей страны, создавали впечатляющие муралы на стенах заводских зданий на улице Октябрьской. Благодаря этому мероприятию уже третий год подряд промышленные районы Минска преображаются и становятся яркими местами на карте города.



Для организации и проведения фестиваля требовалось много волонтеров. И мы, будущие дизайнеры, отправились помочь в оформлении площадки, которую предоставили нам сотрудники молодежного интернет-журнала 34mag.net, в рамках фестиваля урбан-арта. Мы выполнили перечень работ, главной из которых было создание объемных анималистических форм из бумаги, в чем нам очень помогли уроки макетирования. Работы выполнялись в офисе журнала 34mag.net.

Самым ярким моментом нашего пребывания в Минске было то, что мы стали свидетелями завершения граффити художником Рамоном Мартинсом. Это произведение искусства претендует на звание самого большого граффити в мире.

Одним из самых грандиозных событий в рамках фестиваля урбан-арта «Vulica Brasil» стал оупен-эйр на Октябрьской: кроме местных музыкантов и диджеев здесь выступили артисты из Бразилии, которые прилетели с другого континента специально на это мероприятие. Здесь же играл карнавальный бразильский оркестр из 50 барабанщиков. Вход на все мероприятия был свободным.

**Александр КОНОШЁНОК, Ольга РУММО, Наталья ДАГИЛЬ, студенты 3 курса ХГФ.**



# «ВНОВЬ ОБЪЕДИНЕННЫЕ ИСКУССТВОМ»

Экспозиция с говорящим названием «Art-re-unis», что в переводе с французского означает «Вновь объединенные искусством», открылась в витебском Художественном музее. Она рассказывает о творческом пути трех выпускниц художественно-графического факультета нашего университета, которые в этом году отмечают тридцатилетний юбилей со дня окончания учебного заведения.

Можно здесь встретить роспись по шелку и графику Марины Коноваловой, живопись Натальи Коржицкой. Достойное место на выставке занимают предметы декоративно-прикладного искусства – украшения ручной работы, выполненные Еленой Доминевской в технике сутажной вышивки. Броши, кулоны, подвески, заколки, ремешки и пояса – представительницы прекрасного пола всех возрастов найдут украшения для себя. И если для первых двух участниц творчество является основным направлением деятельности, то Елена Михайловна уже более двадцати лет работает главным бухгалтером в редакции газеты «Жыццё Прыдзвіння».

Любовь к живописи и творчеству у Елены Доминевской появилась еще в детстве, поэтому с выбором вуза вопрос не стоял: поступила на художественно-графический факультет. Здесь же познакомилась со своим будущим мужем, обзавелась семьей. После окончания устроилась учителем рисования, черчения и трудового обучения в Мазоловскую школу. Но проработав педагогом пять лет, решила попробовать себя в другой сфере деятельности. Окончив бухгалтерскую школу, устроилась главным бухгалтером. Однако, даже радикально сменив род деятельности, она осталась верна любимому занятию. Вот только путь, который мастерица проделала, чтобы вернуться к творчеству, оказался достаточно долгим. На протяжении всей жизни оно так или иначе сопровождало Елену Михайловну, которая шила детям одежду, вязала шарфики и носки, занималась декорированием дома. Но целенаправленно вернулась к декоративно-прикладному искусству только два с половиной года назад.





– Как-то в институте один из моих любимых преподавателей Иван Иванович Колодовский сказал, что, как бы ни сложилась судьба студентов нашего факультета, чем бы они ни занимались в жизни, придет момент – и они вспомнят все, чему их учили, и эти знания им обязательно пригодятся. Искусство дает нечто большее, и сейчас я понимаю значение этой фразы, потому что в моей жизни настал тот самый момент, когда не творить нельзя, – рассказывает Елена Михайловна.

В один из холодных зимних вечеров она искала в интернете уроки, как своими руками сделать новогодние елочные игрушки, и случайно наткнулась на украшения в сутажной технике. Они так заворожили художницу, что та решила непременно попробовать. С тех пор ее коллекция каждый день пополняется новыми произведениями искусства.

На вопрос, что же вдохновляет на создание украшений, Елена Михайловна отвечает не задумываясь:

– Наши красивые женщины. Мне лишь хочется, чтобы они выглядели еще краше, умели подчеркивать лучшее в самих себе.

Видя, как представительницы прекрасного пола преображаются, стоит им надеть одно из созданных Еленой Михайловной украшений, сразу понимаешь, что своей цели она достигла.

**Юлия ГАВРИЛЕНКО, заведующий отделом редакции газеты «Жыццё Прыдзвіння».**

**На снимках:** во время открытия выставки.

**Фото автора.**

МЫ і ЧАС
ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33.
Тэл. 58-97-92. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам на УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 14.10.2016 г. у 14.30. Тыраж 900.
Аб'ём 1 друк. арк. Зак. 6277.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць два разы на месяц.

Галоўны рэдактар І.М. ПРЫШЧЭПА

Рэдактар Н.П. ЛАЗЕБНАЯ